Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт

**ЗАЦВЯРДЖАЮ**
Прарэктар па вучэбнай рабоце
і адукацыйных інавацыях
_________________ В.М. Здрок
« 2 »     июля          2020 г.

Рэгістрацыйны № УД-8306/вуч.

**Афарыстычнасць мастацкага тэксту**

**Вучэбная праграма ўстановы вышэйшай адукацыі**
**па вучэбнай дысцыпліне для спецыяльнасці**

**1–21 80 11 Мовазнаўства**

***Прафілізацыя:*** Беларускае мовазнаўства

2020 г.

Вучэбная праграма  складзена на аснове ОСВО 1-21 80 11 – 2019, вучэбнага плана № D 21-052/уч. ад 11.04.2019 г.

СКЛАДАЛЬНІК:
Ю. В. Назаранка, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства філалагічнага факультэта БДУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭЦЭНЗЕНТ:
Супрунчук М. В., дацэнт кафедры агульнага мовазнаўства МДЛУ, кандыдат філалагічных навук, дацэнт

РЭКАМЕНДАВАНА ДА ЗАЦВЯРДЖЭННЯ:

Кафедрай беларускага мовазнаўства
(пратакол № 10 ад 14.05.2020 г.)

Навукова-метадычным Саветам Беларускага дзяржаўнага ўніверсітэта
(пратакол № 5 ад 17.06. 2020 г.)

Загадчык кафедры
беларускага мовазнаўства, праф. ____________ Прыгодзіч М.Р.

# ТЛУМАЧАЛЬНАЯ ЗАПІСКА

Веданне агульных пытанняў тэорыі тэксту (структура тэксту, успрыманне тэксту, тыпалогія тэкстаў і інш.), авалоданне навыкамі яго аналізу мае асаблівае значэнне і для спецыялістаў II-й ступені адукацыі ў модулі “Мовазнаўства”.

Асноўная **мэта** вывучэння дысцыпліны “Афарыстычнасць мастацкага тэксту” – сфарміраваць уяўленне аб мастацкім тэксце як аб’екце лінгвістычнага аналізу, аб заканамернасцях пабудовы тэксту, спецыфіцы яго функцыянавання, а таксама тых моўна-маўленчых адзінках і іх сукупнасцях, якія ствараюць афарыстычнасць.

**Задачы** курса:

1. Забяспечыць неабходны аб’ём тэарэтычных звестак аб мастацкім тэксце як сінкрэтычнай з’яве;
2. Сфарміраваць уменне аналізаваць афарыстычнасць мастацкіх тэкстаў рознай жанравай прыналежнасці;
3. Развіваць крэатыўныя магчымасці магістрантаў у плане аналізу тэкстаў розных аўтараў і рознах часоў на прадмет афарыстычнасці і моўных сродкаў яе дасягнення;
4. Фарміраваць уменні крытычна падыходзіць да мастацкіх тэкстаў рознай жанравай прыналежнасці, рэдагаваць і ўдасканальваць іх з мэтай узмацнення выразнасці і афарыстычнасці.

**Месца вучэбнаы дысцыпліны** ў сістэме падрыхтоўкі спецыяліста з вышэйшай адукацыяй (магістра).

Дысцыпліна «Афарыстычнасць мастацкага тэксту» адносіцца да модулю прафілізацыі «Беларуская тэкста- і этналінгвістыка» кампанента ўстановы вышэйшай адукацыі і звязана з такімі лінгвістычнымі дысцыплінамі, як: «Лінгвістыка тэксту», «Сучасная беларуская мова», «Гісторыя беларускай літаратурнай мовы», «Агульнае мовазнаўства», «Гістарычная граматыка беларускай мовы».

**Патрабаванні да кампетэнцый.**

Засваенне вучэбнай дысцыпліны «Афарыстычнасць мастацкага тэксту» павінна забяспечыць фарміраванне наступных спецыялізаваных кампетэнцый:

СК-15 – ведаць асноўныя кірункі заходняй літаратурна-крытычнай думкі, умець выкарыстоўваць метадалогію розных літаратуразнаўчых школ у сваіх даследаваннях.

Патрабаванні да засваення вучэбнай дысцыпліны “Афарыстычнасць мастацкага тэксту” ў адпаведнасці з адукацыйным стандартам:

магістр павінен **ведаць**:

- месца, ролю і значэнне тэкстаў мастацкага сярод тэкстаў іншых стыляў;
- змест паняццяў “афарыстыка” і “афарыстычнасць”;
- асноўныя падыходы ў даследаванні афарыстыкі мастацкага тэксту;
- асноўныя тэкставыя катэгорыі;

- прыёмы і метады вызначэння прэцэдэнтнасці і экспрэсіўнасці тэксту;
- сродкі стварэння вобразнасці на розных узроўнях мовы.

Магістр павінен **умець**:

- праводзіць лінгвістычны і філалагічны аналіз мастацкага тэксту;
- вызначаць моўныя асаблівасці мастацкіх тэкстаў;
- выяўляць ідыястылістычныя асаблівасці (мастацкіх) тэкстаў;
- вызначаць сродкі і прыёмы стварэння афарыстычнасці ў тэксце;
- вызначаць нацыянальна-маркіраваны кампанент у тэкстах мастацкага стылю.

Магістр павінен **валодаць**:

- нормамі вуснага і пісьмовага маўлення сучаснай беларускай літаратурнай мовы;
- уменнямі аналізаваць фактычны матэрыял;
- уменнямі вызначаць сродкі стварэння афарыстычнасці тэкставых адзінак;
- уменнямі праводзіць параўнальны аналіз тэкстаў розных аўтараў, а таксама розных тэкстаў аднаго аўтара на прадмет праяўлення афарыстычнасці ў іх.

**Структура вучэбнай дысцыпліны**

Дысцыпліна вывучаецца ў 3 семестры. Усяго на вывучэнне вучэбнай дысцыпліны «Афарыстычнасць мастацкага тэксту» адведзена:

– для дзённай форма атрымання адукацыі – 90 гадзін, у тым ліку 34 аўдыторныя, з іх: лекцыі – 8 гадзін, практычныя заняткі – 10 гадзін ДН, кіруемая самастойная работа – 16 гадзін (з іх 2 пазааўдыторны кантродь, 4 гадзіны ДН).

Працаёмкасць вучэбнай дысцыпліны складае 3 заліковыя адзінкі.

Форма бягучай атэстацыі па вучэбнай дысціпліне – залік.

# ЗМЕСТ ВУЧЭБНАГА МАТЭРЫЯЛУ

1. **Афарыстыка і афарыстычнасць.** Змест паняццяў, агульнае і адрознае ў іх. Лінгва-рытарычныя передумовы ўзнікнення паняцця “афарыстычнасць”: антычныя рыторыкі, узоры цэласнага філалагічнага аналізу літаратурных твораў, тэорыя мовы мастацкай літаратуры, функцыянальная стылістыка, тэорыя актуальнага члянення выказвання, тэорыя маўленчык актаў, лінгвапрагматыка, тэорыя дэрывацыі, семантычны сінтаксіс і інш.

2. **Афарыстычнасць у шырокім сэнсе.** Семантыка-лінгвістычны механізм пераўтварэння структурна-граматычнай адзінкі (сказа) у адзінку маўлення (выказванне), а выказвання – у адзінку ідыяматыкі (афарызм). Трыяда *сказ-выказванне-афарызм* як шлях спараджэння афарыстычнай адзінкі.

3. **Моўна-стылыстычныя адзнакі афарызма.** Відазмяненне аўтарскага тэксту пры ўключэнні ў іншы кантэкст.

4. **Месца афарызма сярод іншых выслоўных адзінак.** Сістэма жанраў малой слоўнай творчасці. Выкарыстанне аўтарскага выслоўя як спосаб пазбегнуць моўных штампаў і ўзбагачэння маўленчых сродкаў моўнай асобы.

5. **Нацыянальная афарыстыка» (выслоўнасць).** Суадносіны паняццяў “выслоўе” і “афарызм” ў рамках тэрыі поля. Творчасць Якуба Коласа як найярчэйшая ілюстрацыя афарыстычнасці празаічнага і паэтычнага мастацкага тэксту. Выслоўе ў творчай спадчыне Якуба Коласа.

6. **Маўленча-жанравая класіфікацыя выслоўяў Якуба Коласа.** Прэцэдэнтныя для Коласавай творчасці і беларускай культуры лексемы. Іх антэцэдэнтныя дэфініцыі. Моўна-стылістычныя асаблівасці выслоўяў класіка.

7. **Канцэптуальныя паняцці нацыянальнай культуры.** Канцэпты, прэцэдэнтныя лексемы, паняційныя палі – суадносіны і змест паняццяў. Моўна-маўленчыя сродкі іх генералізацыі ў мастацкім тэксце.

8. **Уласна моўныя (нявобразныя) і рытарычныя (вобразныя) сродкі стварэння мастацкага вобраза.** Лексіка і фразеалогія як сродкі дасягнення афарыстычнасці. Парэміялагічныя адзінкі ў моўнай тканцы мастацкіх твораў Я. Коласа.

9. **Сродкі стварэння гумару ў мастацкіх тэкстах.** Афарыстычнасць – камічны эфект – паўзроўневая суаднесенасць. Спосабы і сродкі стварэння аўтарам гумарыстычнага эфекту.

10. **Экспрэсіўнасць як падстава ўзнікнення афарыстычнасці.** Экспрэсіўныя рэсурсы мастацкага тэксту на ўзроўні фанетыкі і графікі. Экспрэсіўны патэнцыял словаўтварэння. Экспрэсіўныя сродкі лексікі і фразеалогіі. Экспрэсіўныя рэсурсы марфалогіі. Сінтаксічныя канструкцыі як прыём экспрэсівізацыі тэксту. Выяўленчыя магчымасці пунктуацыі.

11. **Успрыманне і дэкадзіраванне мастацкага тэксту.** Аўтарская інтэнцыянальная афарыстычнасць і яе трансфармацыі адрасатам. Відазмяненні аўтарскага тэксту. Інтэртэкстуальнасць як праява афарыстычнасці.

## ВУЧЭБНА-МЕТАДЫЧНАЯ КАРТА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЫ

### Дзённая форма атрымання адукацыі з прымяненнем дыстанцыйных адукацыйных тэхналогій

| Нумар раздзела, тэмы | Назва раздзела, тэмы | Колькасць аўдыторных гадзін | | | Колькасць пазаўдытоорных гадзін КСР | Формы кантролю ведаў |
|---|---|---|---|---|---|---|
| | | Лекцыі | Практычныя Заняткі | Колькасць гадзін КСР | | |
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 | 6 | 7 |
| 1 | Афарыстыка і афарыстычнасць. | 2 | | 2 | | Апытванне. |
| 2 | Афарыстычнасць у шырокім сэнсе. | | 2 (ДН) | | | Справаздача па дамашнім заданні. |
| 3 | Моўна-стылыстычныя адзнакі афарызма. | 2 | | | | Пісьмовы тэст. |
| 4 | Месца афарызма сярод іншых выслоўных адзінак. | | 2 (ДН) | 2 | | Вуснае апытванне. |
| 5 | Нацыянальная афарыстыка» (выслоўнасць). | 2 | | | | Падрыхтоўка эсэ. |
| 6 | Маўленча-жанравая класіфікацыя выслоўяў Якуба Коласа. | | 2 (ДН) | | | Справаздача па дамашнім заданні. |
| 7 | Канцэптуальныя паняцці нацыянальнай культуры. | 2 | | 2 | | Рэферат. |
| 8 | Уласна моўныя (нявобразныя) і рытарычныя (вобразныя) сродкі стварэння мастацкага вобраза. | | 2 (ДН) | 2 (ДН) | | Вуснае паведамленне. |
| 9 | Сродкі стварэння гумару ў мастацкіх тэкстах. | | 2 (ДН) | 2 (ДН) | | Справаздача па дамашнім заданні. |
| 10 | Экспрэсіўнасць як падстава ўзнікнення афарыстычнасці. | | | 2 | | Пісьмовы тэст. |
| 11 | Успрыманне і дэкадзіраванне аўтарскага афарызма. | | | 2 | 2 (ПА) | Вучнае апытванне. Рэферат. |

## ІНФАРМАЦЫЙНА-МЕТАДЫЧНАЯ ЧАСТКА

### Асноўная літаратура:

1. Абабурка, М. В. Асновы лінгвістыкі літаратурна-мастацкага тэксту / М. В. Абабурка. – Магілёў, 1997.
2. Абабурка, М.В. Практычныя асновы беларускай лінгвістычнай паэтыкі і тэксталогіі / М.В. Абабурка. – Магілёў, 2003.
3. Абабурка, М.В. Тэарэтычныя асновы беларускай лінгвістычнай тэксталогіі / М.В. Абабурка. – Магілёў, 2003.
4. Зборнік тэкстаў для лінгвістычнага аналізу / аўт.-склад.: З.І. Бадзевіч [і інш.]. – Мінск, 2005.
5. Лепешаў, І. Я. Лінгвістычны аналіз літаратурнага твора / І. Я. Лепешаў. – Мінск, 1981.
6. Лепешаў, І. Я. Лінгвістычны аналіз літаратурнага твора. Частка 2 / І. Я. Лепешаў. – Гродна, 2000.
7. Лепешаў, І.Я. Лінгвістычны аналіз тэксту: вучэб. дапам. / І.Я. Лепешаў. – Мінск, 2009.
8. Лингвистика афоризма. Хрестоматия : учебное пособие / составитель Е.Е. Иванов. – Минск : вышэйшая школа, 2018. – 303 с.
9. Малажай, Г. М. Лінгвістычны аналіз тэксту / Г. М. Малажай. – Мінск., 1992.
10. Михневич А.Е. Афоризмы. Изречения // Языковая природа афоризма. Очерки и извлечения. Могилёв: МГУ им. А.А. Кулешова, 2001.
11. Михневич А.Е. Идиоматика // Белорусский и другие славянские языки: семантика и прагматика. Мн., 2001.
12. Цікоцкі, М. Я. Стылістыка тэксту / М. Я. Цікоцкі. – Мінск, 2002.

### Дадатковая літаратура

1. Арнольд, И.В. Семантика. Стилистика. Интертекстуальность / И.В. Арнольд. – СПб., 1999.
2. Бабенко, Л. Г., Казарин, Ю. В. Лингвистический анализ художественного текста. Теория и практика / Л. Г. Бабенко, Ю. В. Казарин. – Москва, 2004.
3. Болотнова, Н.С. Филологический анализ текста / Н.С.Болотнова. – Москва, 2007.
4. Борисова, Л. В. Интерпретация текста (проза) / Л. В. Борисова. – Минск., 1999.
5. Иванов, Е.Е. Афоризм как объект лингвистики (Очерк истории и проблематики изучения) // Языковая природа афоризма. Очерки и извлечения. – Могилёв, МГУ им. А.А. Кулешова, 2001.

6. Интерпретация художественного текста в вузе и школе. – Санкт-Петербург,1993.

7. Кочан, І. Лінгвістичний аналіз тексту: Курс лекцій / І. Кочан. – Львів, 1999.

8. Кухаренко, В. А. Интерпретация текста / В.А. Кухаренко. – Москва, 1988.

9. Лаврухин, А. Каноны. Афоризмы разных лет. М., 2016.

10. Лінгвістычны аналіз тэксту / пад рэд. Ф. Янкоўскага. – Мінск, 1978.

11. Лукин, В.А. Художественный текст: Основы лингвистической теории. Аналитический минимум / В.А. Лукин. – Москва, 2009.

12. Маслова, В. А. Комплексный анализ художественного текста / В. А. Маслова. – М., 2003.

13. Маслова, В. А. Лингвистический анализ экспрессивности художественного текста / В. А. Маслова. – Минск., 1997.

14. Маслова, В. А. Филологический анализ художественного текста / В. А. Маслова. – Мн., 2000.

15. Пісарук, Г. В., Верамеюк, Г. А. Лінгвістыка тэксту: Практычны матэрыял для студэнтаў філалагічных факультэтаў / Г. В. Пісарук, Г. А. Верамеюк. – Брэст, 1994.

16. Ревуцкий, О. И. Филологический анализ художественного текста / О. И. Ревуцкий. – Минск, 2006.

17. Старасценка, Т. Я. Стылістыка тэксту: дапаможнік / Т. Я. Старасценка. – Мінск: БДПУ, 2007. – 58 с.

18. Супрун, А. Е. Исследования по лингвистике текста / А. Е. Супрун. – Минск, 2001.

19. Тураева, З.Я. Лингвистика текста. Текст: Структура и семантика. – Москва, 2009.

20. Федоренко, Н.Т., Сокольская, Л. И. Афористика. М.: Наука, 1990.

21. Чумак, Л. Н. Синтаксис русского и белорусского языков в аспекте культурологии / Л.Н. Чумак. – Минск, 1997.

22. Шабес, В. Я. Событие и текст / В. Я. Шабес. – Москва, 1989.

23. Шанский, Н. М. Лингвистический анализ стихотворного текста / Н. М. Шанский. – Москва, 2002.

***добавить пару истоников не старше 5 лет**

## ПЕРАЛІК РЭКАМЕНДУЕМЫХ СРОДКАЎ ДЫЯГНОСТЫКІ І МЕТОДЫКА ФАРМІРАВАННЯ ВЫНІКОВАЙ АДЗНАКІ

Для кантролю якасці адукацыі па вучэбнай дысцыпліне “Афарыстычнасць мастацкага тэксту” выкарыстоўваюцца наступныя сродкі дыягностыкі:

- тэсты па вывучаемых раздзелах (тэмах);
- вуснае (пісьмовае) апытванне падчас заняткаў;
- камп’ютарныя тэсты;
- пісьмовыя работы (эсэ, рэферат);
- адзнака па практычных занятках;
- выніковае тэсціраванне.

Рэкамендуемыя сродкі дыягностыкі раскрываюць асноўныя крытэрыі ацэнкі дзейнасці магістрантаў і суадносяцца з формамі кантролю ведаў, зафіксаванымі ў вучэбна-метадычнай карце.

Адзнака за адказы на лекцыях (апытванне) і практычных занятках можа складацца з паўнаты адказу, наяўнасці аргументаў і прыкладаў з практыкі.

Пры ацэнцы навуковага даклада звяртаецца ўвага на: змест і паўнату раскрыцця тэмы, структуру і паслядоўнасць выкладу, крыніцы і іх інтэрпрэтацыю, карэктнасць афармлення, актуальнасць праблемы, карэктнасць выкарыстаныых метадаў даследавання, прыцягненне ведаў з розных галін навукі, арганізацыя калектыўнай дзейнасці, практыкаарыентаванасць атрыманых вынікаў.

Ацэнка эсэ можа фарміравацца на аснове наступных крытэрыяў: арыгінальнасць (навізна) пастаноўкі праблемы і спосабу яе інтэрпрэтацыі / вырашэння, самастойнасць і аргументаванасць меркаванняў, пісьменнасць і стыль выкладу.

Выніковая адзнака па дысцыпліне фарміруецца на аснове трох дакументаў:

1.Правілы правядзення атэстацыі студэнтаў пры засваенні зместу адукацыйных праграм вышэйшай адукацыі ад 29.05.2012 г. (Пастанова Міністэрства адукацыі № 53 от 29 мая 2012 г.).

2. Палажэнне аб рэйтынгавай сістэме ацэнкі ведаў па дысцыпліне ў Беларускім дзяржаўным універсітэце ад 18.08.2015 г.

3. Крытэрыі ацэнкі ведаў і кампетэнцый студэнтаў па 10-бальнай шкале ад 22.12.2003 г.

Пры фарміраванні выніковай адзнакі выкарыстоўваецца рэйтынгавая ацэнка ведаў магістранта, якая дае магчымасць прасачыць і ацаніць дынаміку працэсу дасягнення мэты навучання. Рэйтынгавая ацэнка прадугледжвае выкарыстанне вагавых каэфіцыентаў для бягучага кантролю ведаў і бягучай атэстацыі магістрантаў па дысцыпліне.

Прыкладныя каэфіцыенты, якія вызначаюць унёсак бягучага кантролю ведаў і бягучай атэстацыі ў рэйтынгавую ацэнку:

Фарміраванне ацэнкі за бягучую паспяховасць:

адказы на практычных занятках - 25 %;
падрыхтоўка эсэ- 25 %;
падрыхтоўка рэферата - 25 %;
выкананне тэста - 25 %.

Рэйтынгавая ацэнка па дысцыпліне разлічваецца на аснове ацэнкі бягучай паспяховасці з улікам іх вагавых каэфіцыентаў. Ацэнка бягучай паспяховасці складае 50 %, заліковая ацэнка - 50 %.

## ПРЫКЛАДНЫ ПЕРАЛІК ЗАДАННЯЎ ДЛЯ КІРУЕМАЙ САМАСТОЙНАЙ РАБОТЫ СТУДЭНТАЎ

**1.Афарыстыка і афарыстычнасць (2 гадзіны).**

Завяршыце незакончаныя дэфініцыі, па адной з іх падрыхтуйце разгорнутае эсэ:

1. Афарыстыка – гэта..
2. Афарыстычнасць – гэта..
3. Ідыяматыка – гэта..
4. Ідыяматычнасць прадстаўляе ..
5. Мастацкі тэкст – сінкрэтычная адзінка мовы VS маўлення, якая забяспечвае ўзаемаадносіны аўтара / аўтараў і чытача / чытачоў..

**2. Месца афарызма сярод іншых выслоўных адзінак (2 гадзіны).**

Азнаёмцеся з сінопсісам малых жанраў, у якіх можа рэалізавацца выслоўе. У гэтым зводзе зорачкай пазначаны “аўтарскія тэрміналагічныя вынаходствы” (тыпу *азвярызм, страшылка, зацемка* і пад.) Падрыхтуйце

даклад , у якім паразважайце пра неабходнасць і карыснасць пошуку тэрмінаў для новых, адметных відаў слоўнай творчасці, што нараджаюцца, і, відаць, будуць нараджацца ў мастацка-эстэтычнай практыцы; а таксама тэрміны, што маюць выразны нацыянальны характар, сэнсам і аўтарствам такіх намінацый.

абрэвіятура
адаба*
адагія*
аднарадковік
азвярызм*
азначэнне
акраверш
анекдот
апафегма
афарызм
байка
вака*
вітанне
вокліч
гарык*
гнома
грэгарыя
двухрадковік
джэйхіцу*
досвед
досціп
дражнілка
дыялог
дыятрыба*
жарт
загадка
заклік
замалёўка
замова
запавет
зацемка*
зачын
зваротак
знома*
зычэнне
імператыў*
інвектыва
каламбур
канцоўка
кпін
крылатае слова
лаціфа*
лімэрык*
лічылка
лозунг
максіма
мініяцюра
міф
мота
мудраслоўе
найменне
павучанне
пажаданне
паліндром
панегірык
парадокс
параўнанне
пародыя
пастыш
пацешка
перыфраза
праклён
прароцтва
прыгаворка
прыказка
прымаўка
прыпеўка
прысяганне
прытча
развяжанне
саці*
сентэнцыя
сімвал
скарагаворка
страшылка*
сутра*
тост
фацэцыя*
фларылегія*
фразеалагізм
фрашка*
характарыстыка
хрыя
шарада
эпіграма
эпіграф
эпітафія
эсэ
эўфемізм
……

**3. Канцэптуальныя паняцці нацыянальнай культуры (2 гадзіны).**

Моўна-культурная парадыгма будуецца на падставе аналізу аўтарскай мовы, яе семантычнай сістэмы, яе актуалізацыі ў тэксце згодна з правіламі рытарычнага дыскурсу. Для выслоўяў Якуба Коласа такая парадыгма будзе

уключаць наступныя (найбольш агульныя!) прэцэдэнтныя лексемы: *чалавек, лёс, прырода, радзіма, праца, дарога, думка, слова, гора-радасць, гарэлка, парадак, вобразы-сімвалы*. На падставае кантцэптуальнага аналізу аднаго з мастацкіх твораў (па выбару) распрацуйце пералік канцэптаў дадзенга твора на падставе іх антэцэдэнтных дэфініцый.

**4. Экспрэсіўнасць як падстава ўзнікнення афарыстычнасці (2 гадзіны).**

Прааналізуйце прыведзеныя кантэксты. Паразважайце над сродкамі стварэння экспрэсіі ў іх. Прывядзіце магчымыя маўленчыя сітуацыі, ужыванне прыведзеных афарызмаў у якіх было б дарэчным.

*2.Часамі і дзерава не сцерпіць і скіне галіну, каб прыбіць чалавека. На свеце ёсць мера ўсяму.*
*3.Ды без атак і абароны // Няма сапраўднае вайны.*

*4.Пашквіль жа славы не падмочыць.*
*5 І ад гэтае пары // Прападай мой сум стары!*
*6. Які прывет – такі прыём. //Які тавар – такая плата.*
*7.Часамі скуле і хваробе //Наровяць самі дактары.*

*9.Гэта прыкрае здарэнне // Пайшло яму на паляпшэнне.*
*10.Ды мала што: ніхто ніколі //Не бачыў светлай райскай долі…*
*11. Але той рай мы так малюем, //Што асалоды яго чуем.*
*12.Няма ні веры, ні надзеі //На вельмі добрыя падзеі.*
*13.Праўда, прыкрытая дзяружкаю, цікавей за голую праўду.*
*14.Што напішу, - такі пісака, - // Не расчытае і сабака.*
*15. - А будуць біць? – То што? паплачам. // Затое ж потым і паскачам.*
*16. Каб ведаў толькі ты ды бог // І не здагадвалася жонка.*
*17.Але і тут было няміла: //Адзін бок мёрз, другі смаліла.*
*18.Бог дасць, сухі ўспаўзеш на бераг…*
*19.Не шуршаць паперы // Пад даклад пусты…*
*20. Вітай жа дарогі і вечныя далі,// І вечнага руху святыя скрыжалі…*
*21.Раз бог па слабасці старэчай //Заснуў, задаўшы храпака, //І вось тут чортава рука // Пайшла чыніць благія рэчы.*
*22. І вам ніколі не пашкодзіць // Быць ласкавейшай да мяне.*
*23.… Глядзеце, // Якая цаца зззяе ў смецці!*
*24. Між гэтай боскае даброты// Стаіць, паўлітрык, як паэт,// Гатовы развязаць з ахвотай // Для вас паэзіі кісет.*
*26. Дзве рэчы трэба мець, каханы! //Адна рэч – розум выхаваны, // Другая рэч, Антось харошы:// Таксама трэба мець і грошы…*

**5. Успрыманне і дэкадзіраванне аўтарскага афарызма (2 гадзіны).**

Улічваючы інтэртэкстуальнасць афарыстычнай адзінкі, напішшыце кароткае апавяданне, у склад якога ўвайшлі б наступныя афарызмы адначасова:

*Справядлівасць – гэта мера, якой трэба адмерваць людзям так, як яны таго заслужылі.*
*Люблю я хадзіць над бяздоннем, каб зірнуць яму проста ў вочы.*

*Вячэра яшчэ ў палавіне, а мяне хоць на пупе круці.*

## ПРЫКЛАДНАЯ ТЭМАТЫКА ПРАКТЫЧНЫХ ЗАНЯТКАЎ

### ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 1

**Афарыстычнасць у шырокім сэнсе**.

Механізм спараджэння выслоўя. Моўна-стылыстычныя адзнакі афарызма.

Трыяда сказ-выказванне-выслоўе як этапы спараджэння ўнутранай формы выслоўя.

Эксцэрпцыя выслоўнай адзінкі з аўтарскага тэксту. Межы эксцэрпіраванага тэксту.

Відазмяненне аўтарскага тэксту пры ўключэнні ў іншы кантэкст.

### ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 2

**Месца афарызма сярод іншых моўных адзінак.**

Сістэма жанраў малой слоўнай творчасці. Месца афарызма сярод іншых выслоўных адзінак.

Выкарыстанне аўтарскага выслоўя як спосаб пазбегнуць моўных штампаў і ўзбагачэння маўленчых сродкаў моўнай асобы.

Выслоўі і іх віды (да пытання агульнай тыпалогіі).

Аўтарскае выслоўе як асобы від літаратурна-мастацкага дыскурсу.

### ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 3

**Маўленча-жанравая класіфікацыя выслоўяў Якуба Коласа**

Нацыянальныя культурэмы як спосаб адлюставання моўнай карціны свету.

Антэцэдэнтныя канкардансы ключавых слоў беларускай культуры.

Прэцэдэнтныя для Коласавай творчасці і беларускай культуры лексемы.

Іх антэцэдэнтныя дэфініцыі.

### ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 4

**Уласна моўныя (нявобразныя) і рытарычныя (вобразныя) сродкі стварэння мастацкага вобраза.**

Парэміялагічныя адзінкі ў моўнай тканцы твораў Я. Коласа.

Лексіка і фразеалогія коласавых выслоўяў.

Тропы і фігуры у выслоўях Я. Коласа.

### ПРАКТЫЧНЫЯ ЗАНЯТКІ № 5

**Сродкі стварэння гумару ў мастацкіх тэкстах.**

"Гукавыя жэсты" як сродак стварэння камічнага.

Парэміялагічныя адзінкі ў афарызмах.

Аўтарскія наватворы як праява камічнага.

## ПРЫКЛАДНЫЯ ТЭСТАВЫЯ ЗАДАННІ ПА ВУЧЭБНАЙ ДЫСЦЫПЛІНЕ

**Выпішыце з тэксту паэмы Якуба Коласа “Новая зямля” афарызмы, кіруючыся наступнымі крытэрыямі:**

- сэнсавая завершанасць;
- патэнцыялная інтэртэкстуальнасць;
- трапнасць моўнага ўвасаблення;
- вобразнасць;
- патэнцыяльная варыятыўнасць моўнай формы;
- узнаўляльнасць у іншым кантэксце.

**Размяжуйце пададзеныя азначэнні афарызма на мовазнаўча-тэрміналагічныя і мастацка-вобразныя. Меркаванне абгрунтуйце.**

Афарызм – арыгінальная завершаная думка, выказаная і занатаваная ў лаканічнай запамінальнай тэкставай форме і затым неаднаразова адноўленая іншымі людзьмі (Вікіпедыя).

Афарызмы – не толькі глыбокія думкі, але і афарыстычнае асэнсаванне будзённага (Ілья Шэвелёў).

Афарызм таму і з’яўляецца творам мастацтва, што ён замкнёны ў сабе, хаця і спараджае віхор імклівых асацыяцый (Валянцін Барысаў).

Афарызм (грэч. Aphorismos – сціслае выслоўе) абагульненая, завершаная і глыбокая думка пэўнага аўтара, выражаная ў лаканічнай завостранай форме, якая вызначаецца трапнасцю, выразнасцю формы і нечаканасцю суджэння. Як і праказка, афарызм не даказвае, не аргументуе, а ўздзейнічае на свядомасць арыгінальнай фармулёўкай думкі (БСЭ).

Афарызм – кропля, што замахнулася адлюстраваць у сабе сусвет (Віктар Уласаў).

Афарызмы (грэч.) – сціслыя, адрывістыя фразы, заключаныя ў сціслай, зручнай для запамінання форме пэўную думку, сентэнцыю, абагульненне і пад. (*Энциклопедия Брокгауза и Ефрона. — С.-Пб.: Брокгауз-Ефрон. 1890—1907).*

Прынамсі, усё, што не афарызм – гэта агульныя фразы (Барыс Круцiер).

**З прапанаваных рускім даследчыкам П. Кавалёвым азначэнняў афарыстычнасці выберыце, на вашу думку, самыя ёмістыя і трапныя. Адказ абгрунтуйце:**

1. Афарыстычнасць – гэта калі выказванням аўтара цесна ў берагах наяўнага кантэксту,  і яны пачынаюць жыць самастойна, як навадненне, запаўняючыусё новыя і новыя тэрыторыі. Гэта значыць, думкі аўтара становяцца афарызмамі, уваходзяць у культурны і слоўны  ўжытак, далёка выходзячы за межы прапанаванага кантэксту.

2. Афарыстычнасць – гэта пракладзены ад адзінкавага да агульнага шлях.

3. Афарыстычнасць – уласцівасць развітага розуму.

4. Афарыстычнасць як уласцівасць асобы – схільнасць да насычэння маўлення і пісьмовага выкладу думак афарызмамі – лаканічнымі, адшліфаванымі па форме і  змесце выслоўямі, што выражаюць абагульненую думку; схільнасць да афармлення фразы сціслa, лаканічна, выразна – у афарыстычнай форме.

5. Афарыстычнасць – гэта не нагрувашчванне стракатых слоўцаў без усялякага сэнсу. Сапраўдная афарыстычнасць  – гэта білет у вечнасць. Яна трапляе ў сэрцы людзей, становіцца запатрабаванай, ”просіцца на язык”, набывае статус агульнаўжывальных паняццяў.

6. Афарыстычнасць вырастае з вузкіх штаноў звачайнага апісальніцтва  і на пэўным этапе спеласці аўтара вымае «з шырокіх штанін» завостраныя, выразныя абагульненні, якія набліжаюць чалавека да Абсалютнай Ісціны.

## Апісанне інавацыйных падыходаў і метадаў да выкладання вучэбнай дысцыпліны

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***эўрыстычны падыход***, які прадугледжвае:

- ажыццяўленне магістрантамі асобасна-значных адкрыццяў навакольнага свету;
- дэманстрацыю разнастайнасці вырашэнняў большасці прафесійных задач і жыццёвых праблем;
- творчую самарэалізацыю магістрантаў у працэсе стварэння адукацыйных прадуктаў;
- індывідуалізацыю навучання праз магчымасць самастойна ставіць мэты, ажыццяўляць рэфлексію ўласнай адукацыйнай дзейнасці.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***практыка-арыентаваны падыход***, які прадугледжвае:

- засваенне зместу адукацыі праз вырашэнне практычных задач;
- набыццё навыкаў эфектыўнага выканання розных відаў прафесійнай дзейнасці;

- арыентацыю на генераванне ідэй, рэалізацыю групавых праектаў, развіццё прадпрымальніцкай культуры.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***метад аналізу канкрэтных сітуацый (кейс-метад)***, які прадугледжвае:

- набыццё ведаў і ўменняў для вырашэння практычных задач;
- аналіз сітуацыі з выкарыстаннем прафесійных ведаў, уласнага вопыту, дадатковай літаратуры і іншых крыніц.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца **метад праектнага навучання**, які прадугледжвае:

- спосаб арганізацыі вучэбнай дзейнасці, які развівае актуальныя для вучэбнай і прафесійнай дзейнасці навыкі планавання, самаарганізацыі, супрацоўніцтва і прадугледжвае стварэнне ўласнага прадукта;
- набыццё навыкаў для вырашэння даследчых, творчых, сацыяльных, прадпрымальніцкіх і камунікатыўных задач.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***метад партфоліа***, які з'яўляецца эфектыўным сродкам рэалізацыі індывідуальнай адукацыйнай праграмы магістрантаў. Усе вынікі і дасягненні групуюцца на аснове асноўных відаў дзейнасці магістрантаў: вучэбнай, навукова-даследчай і інш.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца ***метад вучэбнай дыскусіі***, які прадугледжвае ўдзел магістрантаў у мэтанакіраваным абмене думкамі, ідэямі для прад'яўлення і ўзгаднення наяўных пазіцый па адпаведнай праблеме.

Выкарыстанне метаду забяспечвае з'яўленне новага ўзроўню разумення вучэбнай тэмы, ужыванне ведаў (тэорый, канцэпцый) пры вырашэнні праблем.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваюцца **метады і прыёмы развіцця крытычнага мыслення**, якія з’яўляюцца сістэмай, што фарміруе навыкі працы з інфармацыяй у працэсе чытання і канспектавання; разумення інфармацыі як пачатковага, а не канчатковага пункта крытычнага мыслення.

Пры арганізацыі адукацыйнага працэсу выкарыстоўваецца **метад групавога навучання**, які з’уляецца формай арганізацыі вучэбна-пазнавальнай дзейнасці магістрантаў, што прадугледжвае функцыянаванне розных тыпаў міні-груп, якія працуюць як над агульнымі, так і спецыфічнымі вучэбнымі заданнямі.

## Метадычныя рэкамендацыі па арганізацыі самастойнай работы магістрантаў

Змест і формы самастойнай работы магістрантаў распрацоўваюцца, выбіраюцца і адаптуюцца ў адпаведнасці з мэтамі і задачамі падрыхтоўкі спецыялістаў.

Найбольш эфектыўнымі формамі і метадамі арганізацыі самастойнай работы магістрантаў з’яўляюцца:

- выкананне прамежкавых тэстаў;
- распрацоўка індывідуальных і калектыўных навукова-творчых заданняў і праектаў;
- падрыхтоўка і ўдзел у правядзенні актыўных форм навучання (дыскусіі, дэбаты, прэс-канферэнцыі);
- лінгвастылістычны аналіз мастацкіх тэкстаў розных аўтараў;
- вывучэнне магістрантамі навукова-метадычных артыкулаў па праблемах афарыстыкі, іх анатаванне і рэцэнзаванне;
- падрыхтоўка навуковых матэрыялаў, дакладаў, навукова-даследчых работ для ўдзелу ў навукова-практычных канферэнцыях, конкурсах;
- самакантроль шляхам выканання трэніровачных (у тым ліку камп'ютарных) тэстаў і заданняў;
- індывідуальныя кансультацыі з выкладчыкам.

Для арганізацыі самастойнай работы магістрантаў па вучэбнай дысцыпліне выкарыстоўваюцца сучасныя інфармацыйныя рэсурсы, змешчаныя на адукацыйным партале: комплекс вучэбных і вучэбна-метадычных матэрыялаў (вучэбна-праграмныя матэрыялы, вучэбныя выданні для тэарэтычнага вывучэння дысцыпліны, зборнік практыкаванняў, метадычныя ўказанні да практычных заняткаў, матэрыялы бягучага кантролю і бягучай атэстацыі, якія дазваляюць вызначыць адпаведнасць вучэбнай дзейнасці магістрантаў патрабаванням адукацыйных стандартаў вышэйшай адукацыі і вучэбна-праграмнай дакументацыі, у т.л. пытанні для падрыхтоўкі да заліку, заданні, тэсты, пытанні для самакантролю, спіс рэкамендуемай літаратуры, інфармацыйных рэсурсаў і інш.).

## Прыкладны пералік пытанняў да заліку:

1. Афарыстыка і афарыстычнасць: агульнае і адрознае.
2. Нацыянальная афарыстыка (выслоўнасць).
3. Выслоўі і іх віды (да пытання агульнай тыпалогіі).
4. Аўтарскае выслоўе як асобы від літаратурна-мастацкага дыскурсу.
5. Афарыстычнасць у шырокім сэнсе.
6. Механізм спараджэння выслоўя.
7. Сістэма жанраў малой слоўнай творчасці.
8. Месца афарызма сярод іншых выслоўных адзінак.
9. Выкарыстанне аўтарскага выслоўя як спосаб пазбегнуць моўных штампаў і ўзбагачэння маўленчых сродкаў моўнай асобы.
10. Моўна-стылыстычныя адзнакі афарызма.
11. Відазмяненне аўтарскага тэксту пры ўключэнні ў іншы кантэкст.
12. Прэцэдэнтныя лексемы як падстава тэматычнай класіфікацыі выслоўяў.
13. Антэцэдэнтныя канкардансы ключавых слоў беларускай культуры.
14. Творчасць Якуба Коласа як найбагацейшая крыніца афарыстычных адзінак розных жанраў.

15. Афарызм ў творчай спадчыне Якуба Коласа.
16. Маўленча-жанравая класіфікацыя выслоўяў Якуба Коласа.
17. Прэцэдэнтныя для Коласавай творчасці і беларускай культуры лексемы.
18. Моўна-стылістычныя асаблівасці выслоўяў класіка. Уласна моўныя (нявобразныя) і рытарычныя (вобразныя) сродкі стварэння мастацкага вобраза.
19. Парэміялагічныя адзінкі ў моўнай тканцы твораў Я. Коласа.
20. Сродкі стварэння гумару ў выслоўнай спадчыне пісьменніка.

**Узор пісьмовага задання:**

Выберыце адзін-два творы любімага беларускамоўнага аўтара. На іх аснове складзіце міні-слоўнікі прэцэдэнтных лексем аўтара. Дакажыце, прыводзячы прыклады з тэкстаў, што адны кантэксты валодаюць афарыстычнасцю, іншыя – не, адказы абгрунтуйце.

ПРАТАКОЛ УЗГАДНЕННЯ ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ЎСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ

| Назва вучэбнай дысцыпліны, з якой патрабуецца узгадненне | Назва кафедры | Прапановы аб зменах у змесце вучэбнай праграмы па вучэбнай дысцыпліне | Рашэнне, прынятае кафедрай, якая распрацавала вучэбную праграму (з указаннем даты і нумара пратакола) |
|---|---|---|---|
| Беларуская | Беларускага | | Зацвердзіць |

| | | | |
|---|---|---|---|
| этналінгвістыка | мовазнаўства | Няма | 14.05.20 (пратакол № 10) |
| Лингвостилистика | Русского языка | Няма | Зацвердзіць 14.05.20 (пратакол № 10) |

ДАПАЎНЕННІ І ЗМЕНЫ ДА ВУЧЭБНАЙ ПРАГРАМЫ
ЎСТАНОВЫ ВЫШЭЙШАЙ АДУКАЦЫІ
на 202  / 202  вучэбны год

| №№ пп | Дапаўненні і змены | Падстава |
|---|---|---|
| | | |

Вучэбная праграма перагледжана і адобрана на пасяджэнні кафедры
(пратакол № ____ ад ___________ 202_ г.)

Загадчык кафедры
_д.ф.н. прафесар_________________ _______М.Р. Прыгодзіч________
_________________
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча)

ЗАЦВЯРДЖАЮ
Дэкан факультэта
__д.ф.н., прафесар__ ________________ __І.С. Роўда_______
(ступень, званне) (подпіс) (Ініцыялы, прозвішча